# АБ ВЫНІКАХ ДРУГОГА ТУРА ПАЎТОРНЫХ ВЫБАРАЎ ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ТРЫНАЦЦАТАГА СКЛІКАННЯ, ЯКІ АДБЫЎСЯ 10 СНЕЖНЯ 1995 ГОДА

Паведамленне Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў

Разгледзеўшы пратаколы акруговых выбарчых камісій, Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў паведамляе:

Другі тур галасавання паўторных выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання праводзіўся па сто дзевятнаццаці выбарчых акругах. Агульная колькасць выбаршчыкаў па выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у другім туры галасавання паўторных выбараў склала 3537002. Атрымалі выбарчыя бюлетэні 1876634 выбаршчыкі. У галасаванні прынялі ўдзел 1875027 выбаршчыкаў, або 53,0 працэнта ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

У Брэсцкай вобласці прынялі ўдзел у галасаванні 57,7 працэнта, у Віцебскай – 49,1, у Гомельскай – 57,0, у Гродзенскай – 49,0, у Магілёўскай – 58,7, у Мінскай – 55,1, у горадзе Мінску – 49,4 працэнта выбаршчыкаў.

У другім туры галасавання паўторных выбараў выбары адбыліся ў 76 выбарчых акругах. Дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь выбраны ў 59 выбарчых акругах. Цэнтральнай камісіяй зарэгістраваны дэпутаты, якія выбраны па 58 выбарчых акругах.

У 17 выбарчых акругах выбары адбыліся, але ні адзін з кандыдатаў не набраў неабходнай колькасці галасоў выбаршчыкаў.

У 43 выбарчых акругах выбары прызнаны неадбыўшыміся, паколькі ў іх прынялі ўдзел менш паловы выбаршчыкаў.

Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь
па выбарах і правядзенню
рэспубліканскіх рэферэндумаў